# Манеты караля Стэфана Баторыя ў зборы Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея

**Іна КРАЙНЕВА**



Старшы навуковы супрацоўнік аддзела фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея

Баторы Іштван (Bathory Istwan) належаў да старажытнага венгерскага магнацкага роду з Сяміграддзя (Трансільванія), якое ў XVI ст. было самастойнай дзяржавай, асобнай ад Венгрыі, але знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Турцыі.

У Аўстрыі і Польшчы яго называлі Стэфан Баторый (Stefan Batory). Пад гэтым імем ён і ўвайшоў у гісторыю. 25 мая 1571 г. ён быў абраны князем Трансільваніі. А 12 снежня 1575 г., дзякуючы ўплыву польскіх магнатаў Збароўскіх і іншых, элекцыйны (выбарчы) сейм Рэчы Паспалітай абраў Стэфана Баторыя каралём польскім і вялікім князем літоўскім. Каранаваны ён быў 29 красавіка 1576 г. у каралеўскім замку Вавель, а 1 мая ажаніўся з Ганнай Ягелонкай (1523—1596), сястрой апошняга Ягелона — Жыгімонта II Аўгуста. Такім чынам, як бы законна працягвалася панаванне дынастыі Ягелонаў.

У хуткім часе, пасля таго як Стэфан Баторый стаў каралём, яму давялося сутыкнуцца з вельмі заблытанай грашовай сістэмай Рэчы Паспалітай. Насельніцтва зямель гэтай краіны адчувала востры недахоп сродкаў плацяжу. Крызіс паглыбляўся яшчэ і з прычыны масавага вывазу за мяжу ў буйных колькасцях паўнавартасных віленскіх і гданьскіх манет і ўвозу на тэрыторыю Рэчы Паспалітай лёгкаважных іншаземных грошаў.

Манеты ад імя трансільванскага князя Стэфана Баторыя з'явіліся яшчэ да выбрання яго каралём Рэчы Паспалітай. **У Сяміграддзі на манетным двары ў г. Нагі Бане** з 1572 г. па 1576 г. былі выбіты дукаты Баторыя. Пасля выбрання яго каралём Рэчы Паспалітай на гэтым манетным двары ў 1585—1586 гг. былі выпушчаны талеры, а ў 1586 г. — дукаты Стэфана Баторыя. Для тэрыторыі Беларусі яны з'яўляюцца вельмі рэдкімі. **У зборы Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (ГДГАМ) іх няма.**

Кракаўскі сейм 1579—1580 гг. уніфікаваў манетныя сістэмы Польшчы і ВКЛ, усталяваў адзіныя якасныя і метралагічныя нормы для іх эмісій.

**Олькушскі манетны двор** быў адкрыты ў 1578 г., а ў 1579 г. ужо выпусціў значную колькасць манет розных наміналаў: каронныя шэлегі, паўгрошы, грошы і траякі. А з 1580 г. да 1587 г. былі выбіты яшчэ і каронныя дэнары, партугалы і талеры.

З наміналаў, якія выпускаліся на Олькушскім манетным двары ў часы Стэфана Баторыя, у зборы ГДГАМ прадстаўлены **шэлег каронны 1583 г., грош каронны 1581 г.** і **грошы трайныя каронныя 1582 г., 1585 г. і 1586 г.** Усе манеты, якія разглядаюцца ў дадзеным артыкуле, вызначаны згодна каталогу-вызначальніку Эдмунда Капіцкага [2].

**Шэлег каронны 1583 г.** *Kopicki-471* (КП-9973)[1]:

Аверс (Av.): у полі манеты — каралеўская манаграма Стэфана Баторыя ў выглядзе літары "S" пад каронай, з літарамі "**I—D**" па баках; кругавая легенда ўнізе падзелена гербам "**Przegonia**" на тарчы: "STEPHA[NVS] • D[EI] • G[RATIA] — REX • POL[ONIAE] • M[AGNI] • D[VCATVS] • LIT[VANIAE] • " (*малюнак 1*). Ініцыялы "I—D" і герб "Przegonia" ў выглядзе простага мяча з двума паўмесяцамі па баках належалі падскарбію кароннаму ў 1581—1590 гг. **Яну Дульскаму** (Jan Dulski) [1, s. 210].



*Шэлег каронны 1583 г. Kopicki-471 (КП-9973).*

[1] *У дужках пазначаны ўліковыя нумары манет Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.*

Рэверс (Rv.): у полі манеты — тарчы з гербамі Польшчы "Арол" і ВКЛ "Пагоня" пад каронай; кругавая легенда ўверсе падзелена крыжыкам, унізе — гербам Баторыяў "Воўчыя зубы" на тарчы: "SOLIDVS • REG[NI] — POLON[IAE] • 1583".

У 1581 г. выбіты два варыянты грошаў каронных, якія лічацца вельмі рэдкімі (R7 і R8). **Грош каронны 1581 г.** *Kopicki-499* (КП-24182/100):

Av.: правы профіль Стэфана Баторыя ў кароне; кругавая легенда: "STEPHANVS * D[EI] G[RATIA] * REX * POLO[NIAE]".

Rv.: герб Польшчы "Арол" з гербам Баторыяў "Воўчыя зубы" на грудзях; кругавая легенда падзелена каронай на галаве "Арла": "GROSSVS * NO[VY] * REX * POLO[NIAE] * 1◦5◦8◦1" (*малюнак 2*).

**Трайныя грошы каронныя Олькушскага манетнага двара** ў зборы ГДГАМ прадстаўлены трыма манетамі **1582 г.** *Kopicki-519* (КП-24423/1080), **1583 г.** *Kopicki-522* (КП-24423/1082) і **1585 г.** *Kopicki-533* (КП-24423/1083) выпуску (*малюнак 3*).

Аверс у трох манет падобны, хаця і выкананы рознымі штэмпелямі: правы профіль Стэфана Баторыя ў кароне; кругавая легенда: "STEPHAN[VS] • D[EI] G[RATIA] • REX • POL[ONIAE] • M[AGNVS] • D[VX] • L[ITVANIAE] • ".

Рэверс таксама падобны ў трох манет: пад лічбай "III", якая азначае намінал манеты (3 грошы), герб Польшчы "Арол", герб ВКЛ "Пагоня" і паміж імі на тарчы пад каронай — герб Баторыяў "Воўчыя зубы"; пад гербамі — легенда ў 3 радкі: "GROS[SVS] • ARG[ENTVS] / TRIP[LEX] • REG[NI] / POLONIAE"; унізе **чатыры** лічбы, якія азначаюць дату выпуску манеты; паміж імі на тарчы герб — **"Przegonia"**.

Адрозніваюцца рэверсы трайных грошаў каронных 1582 г., 1583 г. і 1585 г. наступным: у трайнога гроша кароннага 1582 г. *Kopicki-519* словы ў легендзе аддзелены **пяціпялёсткавай кветкай і кропкай**; у трайнога гроша кароннага 1583 г. *Kopicki-522* словы ў легендзе аддзелены **прамымі крыжыкамі**, пад датай літары **"I — D"** — ініцыялы Яна Дульскага [1, s. 210; 6, c. 660]. У трайнога гроша кароннага 1585 г. *Kopicki-533* словы ў легендзе аддзелены **кропкамі,** пад датай — літары **"I — D"**, а па баках ад гербаў — літары **"N — H"** — ініцыялы Нікалаўса Хёвель дэ Кальпіна (Nicolaus Hővel de Colpino), які быў мінцмайстрам Олькушскага манетнага двара ў часы Стэфана Баторыя [1, s. 210].

Каронныя шэлегі, траякі і дукаты Стэфана Баторыя ў 1583—1587 гг. выпускаліся і на **манетным двары Познані**. У зборы ГДГАМ толькі адна манета, выпушчаная ў часы Стэфана Баторыя на гэтым манетным двары, — **грош трайны каронны 1586 г.** *Kopicki-538* (КП-24423/1084). Афармленне аверса і рэверса падобнае да афармлення трайных грошаў, адчаканеных у Олькушы. Адрозніваецца познаньская манета ад олькушскіх наступным: дата выпуску пазначана толькі **дзвюма лічбамі** — "86", якія знаходзяцца з аднаго боку ад герба **"Przegonia"**, а з другога боку ад яго — знак у выглядзе **двух перакрыжаваных сцяжкоў з косым крыжыкам пад імі** (*малюнак 4*). Гэтым знакам карыстаўся мінцар Познаньскага манетнага двара ў 1584—1587 гг. і 1590—1592 гг. **Тэадор Буш** (Teodor Busch) [1, s. 212; 6, c. 630 (T. 8—2), 643].

**Вольны горад Гданьск** не спыняў сваю дзейнасць нават падчас аблогі горада ў 1577 г. Манеты Стэфана Баторыя тут пачалі біць у 1578 г., калі былі выпушчаны гданьскія дэнарыі (біліся па 1586 г.), шэлегі (па 1584 г.), грошы (па 1579 г.) і дукаты (па 1588 г.). У 1579 г. і 1582 г. эмітаваліся гданьскія трайныя грошы. **Грошы гданьскія** ў часы Стэфана Баторыя выпускаліся ў **1578—1579 гг.**, абодва прадстаўлены ў зборы ГДГАМ.

Аверсы абедзвюх манет падобныя: правы профіль Стэфана Баторыя ў кароне; кругавая легенда падзелена кропкамі: " • STEPHAN[VS] • D[EI] : G[RATIA] • REX • POL[ONIAE] • D[VX] • P[RVSSIAE] • ".

На рэверсах аднолькавыя кругавыя легенды: " • GROSSVS • CIVI[TATIS] • GEDANENSIS • ". На рэверсе гроша гданьскага 1578 г. *Kopicki-7432* (КП-9804) змешчаны герб Гданьска (два крыжы пад каронай) з лічбамі даты выпуску **"15"** і **"78"** па баках; кругавая легенда ўверсе падзелена **крыжыкам**, словы аддзелены **8-канцовай** і **10-канцовай зоркамі**. На рэверсе гроша гданьскага 1579 г. *Kopicki-7433* (КП-10228) (*малюнак 5*) змешчаны **на картушы** герб Гданьска (два крыжы пад каронай) з лічбамі даты выпуску **"7"** і **"9"** па баках; кругавая легенда напрыканцы мае герб **"Пярсцёнак"**, які належаў трымальніку Гданьскага манетнага двара ў 1578—1587 гг. **Гансу Гаэблю** (Hans Goebl) [4, s. 19]. **Гданьскіх дэнарыяў,**



***Малюнак 2.***
*Грош каронны 1581 г.*
*Kopicki-499 (КП-24182/100).*



***Малюнак 4.***
*Грош трайны каронны познаньскі 1586 г.*
*Kopicki-538 (КП-24423/1084).*



***Малюнак 3.***
*Грош трайны каронны олькушскі 1586 г.*
*Kopicki-533 (КП-24423/1083).*



***Малюнак 5.***
*Грош гданьскі 1579 г.*
*Kopicki-7433 (КП-10228).*

**шэлегаў, трайных грошаў і дукатаў Стэфана Баторыя ў зборы ГДГАМ няма**.

У 1584 г. (па Гумоўскаму — у 1585 г.) брат Ганса Гаэбля **Каспар** (Kasper Goebl) адчыніў **манетны двор у Мальбарку**, куды пераехаў у 1587 г. пасля закрыцця Гданьскага манетнага двара. З 1591 г. ён кіраваў манетным дваром у Мальбарку і яшчэ ў 1602 г. займаў там пасаду войта [4, s. 19—20]. У 1584—1585 гг. на Мальбаркскім манетным двары былі выпушчаны шэлегі прускія Стэфана Баторыя. У 1584 г. былі выбіты прускія грошы, а ў 1585 г. — прускія трохграшовікі і дукаты. **Прускіх манет, выбітых у Мальбарку ў часы Стэфана Баторыя, у зборы ГДГАМ няма**.

Манеты Стэфана Баторыя на **Рыжскім манетным двары** пачалі выпускаць яшчэ ў 1580 г. У 1581 г. Баторый захапіў Лівонію, манетны двор якой у Рызе пачаў выпуск манет па польска-літоўскай стапе. Былі выбіты шэлегі (біліся па 1586 г.) і траякі (па 1586 г.). У 1581 г. пачалі выпускаць грошы рыжскія (па 1584 г.). Толькі на працягу аднаго 1582 г. выпускалі рыжскія дэнарыі. З 1584 г. па 1586 г. эмітавалі рыжскія дукаты. Вядома некалькі экзэмпляраў рыжскага партугала, які выпускалі ў 1586 г.

У зборы ГДГАМ ёсць **шэлег рыжскі 1584 г.** *Kopicki-8074* (КП-9815).

Av.: манаграма Стэфана Баторыя ў выглядзе літары “S” пад каронай і гербам Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы; кругавая легенда падзелена ўверсе каронай: “STEP[HANVS] • D[EI] : G[RATIA] : REX • POL[ONIAE] • ” (*малюнак 6*).

Rv.: на картушы герб Рыгі (перакрыжаваныя ключы пад крыжам) з лічбамі даты выпуску “8” і “4” па баках; кругавая легенда ўверсе падзелена навершам картуша, напрыканцы — герб **“Лілея”**: “SOLIDVS : CIVI[TATIS] : RIGE[NSIS]”. Герб “Лілея” належаў **Герману Вульфу** (Herman Wulff), які трымаў манетны двор Рыгі ў 1582—1609 гг. [6, с. 629 (Т . 6—1), 641].

У зборы ГДГАМ ёсць 2 **рыжскія грошы: 1581 г.** *Kopicki-8083* (КП-24182/101) і **1582 г.** *Kopicki-8085* (КП-9860) (*малюнак 7*). Афармленне ў іх аднолькавае.

Av.: правы профіль Баторыя ў кароне; кругавая легенда: “STEP[HANVS] ◦ D[EI] ◦ G[RATIA] ◦ REX ◦ PO[LONIAE] ◦ M[AGNVS] ◦ D[VX] ◦ LI[TVANIAE] • ”.

Rv.: герб Рыгі ў выглядзе брамы пад перакрыжаванымі ключамі і крыжам, з колцамі па баках; па баках ад герба лічбы, якія азначаюць дату выпуску манеты; пад гербам лічба “I”, якая азначае намінал манеты (1 грош) з дзвюма **5-пялёсткавымі кветкамі** па баках; кругавая легенда: “GROSSVS ◦ CIVITATIS ◦ RIG[ENSIS]”.

**Адрозненні** толькі ў напісанні даты выпуску. На грошы 1581 г. яны пазначаны **чатырма** лічбамі — “15” і “81”, а на манеце 1582 г. — **дзвюма** — “8” і “Z”.

**Трайныя грошы рыжскія** Стэфана Баторыя прадстаўлены манетамі 1582 г. *Kopicki-8091* (КП-24423/1090), 1583 г. *Kopicki-8092* (КП-24423/1092), 1584 г. *Kopicki-8093* (КП-24423/1123), пяццю варыянтамі манет 1585 г. *Kopicki-8094а* (КП-24423/1156), *Kopicki-8094в* (КП-24423/1162), *Kopicki-8095* (КП-24423/1130) (*малюнак 8*), *Kopicki-8096а* (КП-24423/1147), *Kopicki-8096в* (КП-24423/1127) і манетамі 1586 г. выпуску *Kopicki-8097* (КП-24423/1218), *Kopicki-8098 (?)* (КП-24423/1201).

У 1582—1584 гг. на Рыжскім манетным двары было выбіта па адным варыянце трайных грошаў. Афармленне манет падобнае:

Av.: правы профіль Стэфана Баторыя ў кароне; кругавая легенда: “• STEP[HANVS] • D[EI] • G[RATIA] • REX • PO[LONIAE] • D[VX] • L[ITVANIAE] • ”.

Rv.: герб Рыгі ў выглядзе брамы пад перакрыжаванымі ключамі і крыжам; па баках ад герба лічбы, якія азначаюць дату выпуску манеты; над гербам Рыгі лічба “III”, якая азначае намінал (3 грошы); легенда ў 4 радкі, словы аддзелены кропкай і колцамі: “GR — OS[SVS] / ARG[ENTVS] • TRIP[LEX] / CIVI[TATIS] ◦ RI/ GEN[SIS] ◦ ”. На рэверсе па баках лічбы “III”, якая азначае намінал, на манетах 1582 г. *Kopicki-8091* (КП-24423/1090) і 1584 г. *Kopicki-8093* (КП-24423/1123) выбіты дзве **5-пялёсткавыя кветкі**, на манеце 1583 г. *Kopicki-8092* (КП-24423/1092) — дзве **5-канцовыя зоркі**.

У манет 1585 г. выявы аверса падобныя, рэверсы ж адрозніваюцца знакамі, якія размешчаны па баках ад лічбы “III”, якая азначае намінал:

1. *Kopicki-8094а* (КП-24423/1156) **—** дзве **5-пялёсткавыя кветкі;**
2. *Kopicki-8094в* (КП-24423/1162) — дзве **3-пялёсткавыя кветкі;**
3. *Kopicki-8095* (КП-24423/1130) **—** два **гербы “Лілея”;**
4. *Kopicki-8096а* (КП-24423/1147) — два **прамыя крыжыкі;**
5. *Kopicki-8096в* (КП-24423/1127) — два **прамыя крыжыкі** і два **гербы “Лілея”.**

Легенда на рэверсе манеты *Kopicki-8095* (КП-24423/1130) размешчана ў **3 радкі**, на астатніх манетах 1585 г. — у **чатыры.**

Згодна каталогу-вызначальніку Эдмунда Капіцкага трайныя рыжскія грошы ў 1586 г. былі выпушчаны двух відаў: *Kopicki-8097* (КП-24423/1218) і *Kopicki-8098*. Манеты, якія класіфікуюцца *нумарам 8098*, адрозніваюцца ад папярэдніх **адсутнасцю лічбы**



***Малюнак 6.***
*Шэлег рыжскі 1584 г.*
*Kopicki-8074 (КП-9815).*



***Малюнак 7.***
*Грош рыжскі 1582 г.*
*Kopicki-8085 (КП-9860).*



***Малюнак 8.***
*Грош трайны рыжскі 1585 г.*
*Kopicki-8095 (КП-24423/1130).*

“III”, якая азначае намінал, і з’яўляюцца вельмі рэдкімі (R 8). У зборы ГДГАМ ёсць некалькі трайных грошаў рыжскіх 1586 г., на рэверсе якіх адсутнічае лічба “III”. Але, пэўна, іх нельга класіфікаваць нумарам *Kopicki-8098* (КП-24423/1201), таму што, хутчэй за ўсё, лічба “III” папросту **на іх сцёрта.**

Найвялікшыя змены сярод тых, што адбываліся ў часы Стэфана Баторыя, закранулі манетную сістэму Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Па сутнасці, яна была ліквідавана і стала аднолькавай з польскай манетнай сістэмай.

Пасля таго як у 1570 г. на Віленскім манетным двары былі выбіты апошнія двайныя дэнарыі, зноў манетны станок запусцілі толькі ў 1579 г. З прычыны цяжкасцяў з наборам персаналу, набыццём абсталявання, матэрыялу і г. д. у ВКЛ у 1579 г. у Вільні выпусцілі толькі пробныя шэлегі.

На Варшаўскім сейме 5 студзеня 1580 г. кароль выдаў статут, які тычыўся ўсіх манетных двароў у Рэчы Паспалітай. Ён не толькі змяніў манетную стапу, якая існавала дагэтуль, але і адрэгуляваў прадпрымальніцкую дзейнасць адміністрацый манетных двароў. Статут зацвердзіў выпуск наступных манет: талеры, паўталеры, шасціграшовікі, грошы трайныя, грошы, паўгрошы, шэлегі, тэрнарыі і дэнарыі — кожны з наміналаў павінен быў чаканіцца згодна адпаведнай стапе. Усе гэтыя загады тычыліся толькі выпуску срэбнай манеты.

Не ўсе наміналы, якія прадпісваў статут, былі выбіты ў Вільні. Не выбіты паўталеры, паўгрошы і тэрнарыі літоўскія. Былі выбіты: дэнарыі, шэлегі, грошы, трайныя грошы, шасціграшовікі і талеры срэбныя, а таксама залатыя дукаты. **У зборы ГДГАМ адсутнічаюць літоўскія дэнарыі, грошы, шасціграшовікі, талеры і дукаты Стэфана Баторыя.**

**Шэлегі літоўскія** ўпершыню пачалі біць у часы Стэфана Баторыя і выпускалі з 1579 г. па 1585 г. У зборы ГДГАМ гэты намінал прадстаўлены адной манетай **1581 г.** *Kopicki-3348* (КП-9914):

Av.: у полі манеты — каралеўская манаграма Стэфана Баторыя ў выглядзе літары “S” з гербам Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы; кругавая легенда падзелена ўверсе каронай: “STEP[H]A[NVS] • D[EI] • G[RATIA] • REX • POL[ONIAE]”.

Rv.: у полі манеты пад каронай — тарчы з гербамі Польшчы “Арол” і ВКЛ “Пагоня” і герб **“Ляліва”**; кругавая легенда ўверсе падзелена **“Трылісьнікам”**: “SOLIDVS • MAG[NVS] • D[VX] • L[ITVANIAE] 1581” (*малюнак 9*). Герб “Ляліва” ў выглядзе зоркі над маладзіком (ражкамі ўверх), які належаў **Яну Хлябовічу** (Jan Hlebowicz), вялікаму падскарбію літоўскаму ў 1580—1583 гг. [6, с. 630 (Т. 8—12), 643]. “Трыліснік” — **знак невядомага мінцмайстра, гравёра і медальера** Віленскага манетнага двара з **ініцыяламі “PP”**, якімі пазначаліся манеты ВКЛ у 1579—1591 гг. [3, s. 102].



***Малюнак 9.***
*Шэлег літоўскі 1581 г.*
*Kopicki-3348 (КП-9914).*

Цікава, што на манеце ВКЛ у тытуле Стэфана Баторыя не пазначана, што ён вялікі князь літоўскі.

**Грошы трайныя літоўскія** Стэфана Баторыя выпускаліся ў 1580—1586 гг. і мелі найбольш разнастайнасцяў у параўнанні з іншымі наміналамі манет Віленскага манетнага двара гэтага часу. У зборы ГДГАМ гэты намінал прадстаўлены найбольш поўна. Ёсць манеты ўсіх гадоў, якія выпускаліся ў часы Стэфана Баторыя, за выключэннем найбольш рэдкіх варыянтаў.

На аверсе ўсіх трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя: правы профіль Стэфана Баторыя ў кароне; кругавая легенда пачынаецца зверху: “STEP[HANVS] ◦ D[EI] ◦ G[RATIA] ◦ REX ◦ POL[ONIAE] ◦ M[AGNVS] ◦ D[VX] ◦ L[ITVANIAE]”. Менавіта так аформлены аверсы манет 1580 г. *Kopicki-3359* (КП-24423/0905), 1584 г. *Kopicki-3372* (КП-24423/1032) і *Kopicki-3373* (КП-24423/1044), 1585 г. *Kopicki-3374* (КП-24423/1045), 1586 г. *Kopicki-3379a* (КП-24423/1078) і *Kopicki-3379в* (КП-24423/1079). На аверсах гэтых манет **адсутнічаюць яшчэ якія-небудзь знакі.**

**Асаблівасцямі** ў афармленні аверсаў трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя з’яўляюцца наступныя:

1. На манеце 1580 г., якая класіфікуецца як *Kopicki-3359* (КП-24423/0905), тытул Стэфана Баторыя пазначаны як “STEP[HANVS] ◦ D[EI] ◦ G[RATIA] ◦ REX ◦ POL[ONIAE] ◦ M[AGNVS] ◦ **D[VX LITVANIAE]**”. Гэта азначае, што на манеце ВКЛ у тытуле яе ўладара не пазначана, што ён вялікі князь **літоўскі.**
2. На манетах 1580—1581 гг. *Kopicki-3360* (КП-24423/0918), *Kopicki-3361* (КП-24423/0906), *Kopicki-3363* (КП-24423/0974) кругавая легенда аверса ўнізе падзелена **лічбай “III”**, якая азначае намінал манеты. На манетах 1580 г. *Kopicki-3360* (КП-24423/0918) і 1581 г. *Kopicki-3363* (КП-24423/0974) лічба змешчана ў **авальную рамку**, а на манеце 1580 г. *Kopicki-3361* (КП-24423/0906) — у **фігурную.**
3. Кругавая легенда аверса на манетах 1581 г. *Kopicki-3365* (КП-24423/0954) і *Kopicki-3366* (КП-24423/0967), 1582 г. *Kopicki-3368* (КП-24423/0995) і 1583 г. *Kopicki-3370* (КП-24423/1018) унізе падзелена гербам вялікага падскарбія літоўскага ў 1580—1583 гг. Яна Хлябовіча **“Ляліва”.**
4. Кругавая легенда аверса на манетах 1585 г. *Kopicki-3375* (КП-24423/1048); *Kopicki-3376* (КП-24423/1054) і *Kopicki-3377* (КП-24423/1050) і 1586 г. *Kopicki-3378* (КП-24423/1062) унізе падзелена гербам **“Ліс”** (у выглядзе вертыкальнай стралы з дзвюма перакладзінамі) падканцлера ВКЛ у 1585—1589 гг. **Льва Сапегі** [6, с. 630 (Т. 7—9), 642]. На манеце 1585 г. *Kopicki-3375* (КП-24423/1048) герб **“Ліс” з перакладзінай замест стралы.** На манеце 1585 г. *Kopicki-3376* (КП-24423/1054) герб **“Ліс” з кароткай і доўгай перакладзінамі.** На манетах 1585 г. *Kopicki-3377* (КП-24423/1050) і 1586 г. *Kopicki-3378* (КП-24423/1062) выява герба **“Ліс”** пададзена класічна — **з аднолькавымі перакладзінамі.**

На рэверсе ўсіх трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя змешчаны: уверсе герб Польшчы “Арол” і герб ВКЛ “Пагоня”; легенда ў 3 радкі: “GROS[SVS] .

ARG[ENTVS] / TRIP[LEX]. M[AGNI] D[VCATVS] / LIT — VA[NIAE].”; паміж лічбамі, якія азначаюць дату выпуску манеты, на тарчы — герб Баторыяў “Воўчыя зубы”.

Рэверсы трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя мелі шмат варыянтаў у сваім афармленні. Разгледзім іх па гадах выпуску.

У зборы ГДГАМ з пяці магчымых ёсць 3 варыянты трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя 1580 г.: *Kopicki-3359* (КП-24423/0905), *Kopicki-3360* (КП-24423/0918) і *Kopicki-3361* (КП-24423/0906).

На рэверсе трайнога гроша літоўскага 1580 г. *Kopicki-3359* (КП-24423/0905) уверсе змешчана лічба “III”, якая азначае намінал. Па баках ад “Арла” і “Пагоні” — **трохпялёстнікі**. Унізе, пад легендай, — лічбы “15” і “80”, якія азначаюць 1580 г. — дату выпуску манеты, паміж якімі на тарчы — герб Баторыяў “Воўчыя зубы”.

У трайных грошаў літоўскіх 1580 г. *Kopicki-3360* (КП-24423/0918) і *Kopicki-3361* (КП-24423/0906) лічба “III”, якая азначае намінал, на рэверсе адсутнічае, а ў манеты *Kopicki-3361* (КП-24423/0906) адсутнічаюць і **трохпялёстнікі** па баках ад “Арла” і “Пагоні”.

У зборы ГДГАМ ёсць 3 варыянты з чатырох трайных грошаў літоўскіх Стэфана Баторыя 1581 г.: *Kopicki-3363* (КП-24423/0974), *Kopicki-3365* (КП-24423/0954), а таксама *Kopicki-3366* (КП-24423/0967), які адносіцца да вельмі рэдкіх (R 7) (*малюнак 10*). Лічба “III”, якая азначае намінал, змешчана ўверсе на рэверсах трох манет. Герб Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы з лічбамі “15” і “81” па баках на манеце *Kopicki-3363* (КП-24423/0974) змешчаны пад легендай, а на трайных грошах літоўскіх *Kopicki-3365* (КП-24423/0954) і *Kopicki-3366* (КП-24423/0967) — пад “Арлом” і “Пагоняй”. На манеце *Kopicki-3366* (КП-24423/0967) паміж “Арлом” і “Пагоняй” змешчаны “**Лісцік**” — знак невядомага гравёра, медальера і мінцмайстра Віленскага манетнага двара ў 1579—1591 гг. з ініцыяламі “**PP**” [3, s. 102].

У зборы ГДГАМ ёсць па адным варыянце трайных грошаў літоўскіх з двух варыянтаў, выбітых у 1582 г., *Kopicki-3368* (КП-24423/0995) і з трох варыянтаў, выбітых у 1583 г., *Kopicki-3370* (КП-24423/1018). На рэверсах гэтых манет лічба “III”, якая азначае намінал, змешчана ўверсе, а герб Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы з лічбамі даты выпуску манеты — пад “Арлом” і “Пагоняй”.

У зборы ГДГАМ ёсць абодва варыянты трайных грошаў літоўскіх, выбітых у 1584 г. На іх, як і на папярэдніх, лічба “III”, якая азначае намінал, змешчана ўверсе, а герб Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы з лічбамі даты выпуску манеты па баках — пад “Арлом” і “Пагоняй”. На манеце *Kopicki-3372* (КП-24423/1032) герб Баторыяў “Воўчыя зубы”, як і ўсе вышэйапісаныя варыянты трайных грошаў літоўскіх, не мае кароны, а на манеце *Kopicki-3373* (КП-24423/1044), як і на ўсіх трайных грошах літоўскіх 1585 г. і 1586 г., яна ўжо ёсць. На трайным грошы літоўскім *Kopicki-3373* (КП-24423/1044) унізе змешчаны 2 сэрцападобныя лісцікі на галінках — знак невядомага мінцмайстра Віленскага манетнага двара ў 1579—1591 гг. з ініцыяламі “PP”.

У зборы ГДГАМ ёсць усе 4 варыянты трайных грошаў літоўскіх, выбітых у 1585 г.: *Kopicki-3374* (КП-24423/1045), *Kopicki-3375* (КП-24423/1048), *Kopicki-3376* (КП-24423/1054) і *Kopicki-3377* (КП-24423/1050). Адрозненні ў гэтых манет толькі на аверсах. Рэверсы ж у іх аднолькавыя: лічба “III”, якая азначае намінал, змешчана ўверсе, а герб Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы пад каронай з лічбамі даты выпуску манеты “15” і “85” па баках — пад “Арлом” і “Пагоняй”. Унізе, пад легендай, змешчаны **2 сэрцападобныя лісцікі — на галінках**.

У зборы ГДГАМ ёсць усе 3 варыянты трайных грошаў літоўскіх, выбітых у 1586 г.: *Kopicki-3378* (КП-24423/1062), *Kopicki-3379а* (КП-24423/1078) і *Kopicki-3379в* (КП-24423/1079). Рэверсы ў іх амаль аднолькавыя: лічба “III”, якая азначае намінал, змешчана ўверсе, а герб Баторыяў “Воўчыя зубы” на тарчы пад каронай з лічбамі даты выпуску манеты “15” і “86” па баках — пад “Арлом” і “Пагоняй”. Унізе, пад легендай, змешчаны **2 сэрцападобныя лісцікі**. На манеце *Kopicki-3378* (КП-24423/1062) лісцікі **на галінках**, а на манетах *Kopicki-3379а* (КП-24423/1078) і *Kopicki-3379в* (КП-24423/1079) — **без галінак**. Манеты *Kopicki-3379а* (КП-24423/1078) і *Kopicki-3379в* (КП-24423/1079) адрозніваюцца толькі дыяметрам. Дыяметр манеты *Kopicki-3379а* (КП-24423/1078) — 19,1 мм, а манеты *Kopicki-3379в* (КП-24423/1079) — 20,7 мм.

Вядомыя двудэнарыі 1578—1579 гг. з манаграмай Стэфана Баторыя на адным баку і “Пагоняй” ВКЛ — на другім. У зборы ГДГАМ ёсць такі **двудэнарый літоўскі 1579 г.** *Kopicki*-4004 (КП-56467). Пад каралеўскай манаграмай змешчаны **герб Готарда Кетлера** (Gotard Kettler) — **конскія цуглі**, што сведчыць аб тым, што гэта манета не літоўская, а **курляндская**, зробленая на манетным двары ў **Мітаве** па аналогіі з двудэнарыямі Жыгімонта Аўгуста (*малюнак 11*). Не маглі гэтыя манеты быць выбітымі ў Вільні яшчэ і таму, што маюць на штэмпелі толькі выяву “Пагоні”, а не “Арла” і “Пагоні”, што было абавязковым для манет ВКЛ з часоў Люблінскай уніі.

Пасля замацавання Стэфана Баторыя на троне караля Рэчы Паспалітай, ва ўмовах, калі працягвалася Лівонская вайна, усходні накірунак знешняй палітыкі становіцца галоўным. Гародня з усіх буйных гарадоў ВКЛ, за выключэннем занятага тады маскоўскім войскам Полацка, была бліжэй размешчана да старажытных шляхоў у Інфлянты (Лівонія). Да таго ж кароль імкнуўся палепшыць адносіны паміж Ка-



**Малюнак 10.**
*Грош трайны літоўскі 1581 г.*
*Kopicki-3366 (КП-24423/0967).*



**Малюнак 11.**
*Двудэнарый літоўскі 1579 г.*
*Kopicki-4004 (КП-56467).*

ронай і Княствам. Гэта і стала прычынай пераносу каралеўскай рэзідэнцыі з Кракава ў Гародню ў 1579 г. Горад на нейкі час становіцца неафіцыйнай сталіцай не толькі ВКЛ, але і ўсёй Рэчы Паспалітай. Адсюль ідуць шматлікія прывілеі, загады аб скліканні войска і іншыя афіцыйныя дакументы. Тут распрацоўваліся планы новых ваенных паходаў на Усход.

Кароль быў уражаны прыгажосцю Гародні і яе ваколіц. Ні адзін з каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх не надаваў столькі ўвагі развіццю і дабрабыту Гародні, як Стэфан Баторый. Нездарма не толькі яго сучаснікі, але і іх нашчадкі называлі Гародню "горадам Баторыя".

Стэфан Баторый у 1576 г. пацвердзіў усе прывілеі, падараваныя раней Гародні вялікімі князямі літоўскімі. Такім чынам, юрыдычна было замацавана становішча горада як аднаго з важных цэнтраў дзяржавы. Замест гатычнага замка Вітаўта для сваёй рэзідэнцыі Стэфан Баторый загадаў пабудаваць замак у стылі рэнесанс. У Гародню былі запрошаны архітэктары, будаўнікі і рамеснікі з іншых гарадоў ВКЛ і з-за мяжы. Узначаліў будаўніцтва дойлід Санці Гучы з Фларэнцыі. У 1580 г. замак быў перабудаваны і прыстасаваны не толькі для абарончых мэт, але і для пражывання. Урэшце, у 1585 г. Стэфан Баторый прыбыў у Гародню на доўгі час. Афіцыйна — каб кіраваць упрыгожваннем замка, а фактычна — каб рыхтаваць новую вайну супраць Маскоўскай дзяржавы. Тут, у Гародні, 12 снежня 1586 г. Стэфан Баторый памёр. На думку яго асабістага лекара Шымона Сымоніуса — ад пнеўманіі і сардэчнай недастатковасці. Паўтары гады астанкі караля знаходзіліся ў яго любімым горадзе. Потым, насуперак яго волі, бо ён хацеў быць пахаваным у Гародні, 29 красавіка 1588 г. жалобны картэж рушыў праз Варшаву у Кракаў. Там 24 мая 1588 г. астанкі караля былі пахаваны ў Вавельскім замку [4, s. 24—27].

За некалькі стагоддзяў свайго існавання гарадзенскі замак Стэфана Баторыя шмат пацярпеў падчас руска-польскай вайны і шведскага нашэсця сярэдзіны XVII ст., а таксама падчас Паўночнай вайны 1700—1721 гг. У 1706 г. і 1708 г. ён быў зруйнаваны шведамі. У 1729 г. яго будынкі з боку Нёмана абрынуліся ў раку, а ў 1735 г. страты нанёс моцны пажар.

У 1729 г. у сувязі з правядзеннем у Гародні кожнага трэцяга сейма Рэчы Паспалітай было прынята рашэнне аб узвядзенні новай каралеўскай рэзідэнцыі на Ніжнім замку, побач з гарадзенскай Замкавай гарой. У Старым замку Стэфана Баторыя быў зроблены буйны рамонт, пасля якога ў ім размясцілі частку каралеўскай світы і розныя службы. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай і ад'езду Станіслава Аўгуста Панятоўскага з Гародні ў Санкт-Пецярбург у Старым замку Стэфана Баторыя адбылася чарговая рэканструкцыя, у выніку якой дэкор фасадаў палаца быў знішчаны.

У Старым замку з 1930 г. месціцца Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. З таго часу выгляд палаца практычна не змяніўся. У 2008 г. быў зацверджаны план рэканструкцыі Старога замка, якую будуць праводзіць згодна праекту, створанаму архітэктарам У. Бачковым. У выніку рэканструкцыі замак зноў будзе выглядаць амаль як у часы Стэфана Баторыя.

Усяго у зборы ГДГАМ налічваецца 383 манеты (39 варыянтаў) часоў Стэфана Баторыя, выпушчаныя на манетных дварах у Олькушы, Познані, Гданьску, Рызе, Вільні і Мітаве. З іх толькі 13 манет адзінкавыя. Гэта КП-9804, КП-9815, КП-9860, КП-9883, КП-9889, КП-9900, КП-9902, КП-9914, КП-9916, КП-9973, КП-10228, КП-10235/23 і КП-56467. Астатнія ўваходзілі ў склад двух скарбаў. Тры манеты, КП-24182/099—101, паходзяць са скарба, знойдзенага ў 1953 г. на беразе Нёмана ля вёскі Дубна (усяго ў скарбе 395 манет). Астатнія 367 манет з'яўляюцца часткай скарба манет XVI ст., знойдзенага ля вёскі Баяры Гродзенскай вобласці ў чэрвені 1954 г. на глыбіні 10 см ад паверхні зямлі. Гэты скарб з уліковым нумарам КП-24423 складаецца з 1660 манет.

Данае даследаванне манет Стэфана Баторыя ў зборы Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея можа выкарыстоўвацца пры папаўненні калекцыі нумізматыкі ГДГАМ.

*(Аўтар выказвае падзяку за дапамогу падчас збору матэрыялаў і падрыхтоўкі данага артыкула супрацоўнікам АРКіС ГДГАМ Л.В. Фёдаравай і А.А. Данілевіч.)*

***Спіс літаратуры:***

*1. Szwagrzyk, J.A. Pieniądz na ziemiach Polskich X — XX w. / Józef Andrzej Szwagrzyk. — Wrocław — Warszawa — Kraków — Gdańsk, 1973. — 360 s. + tablice.*

*2. Kopicki, E. Ilustrowany skorowidz pieniędzy polskich i z Polską związanych / Edmund Kopicki. — Polskie Towarzystwo Numizmatychne. Zarząd główny. — Warszawa, 1995.*

*3. Gumowski, M. Mennica Wileńska w XVI i XVII wieku. Tom II / M. Gumowski. — Warszawa, 1921. — 200 s.*

*4. Gumowski, M. Medale Stefana Batorego / Maryan Gumowski. — Kraków, 1913. — 64 s.*

*5. Грыцкевіч, А. Стэфан Баторый і Гародня // Беларускі гістарычны часопіс, 1994. — № 4. — С. 22—27.*

*6. Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. — Минск: Полымя, 1995. — 687 с.*